***5 сакавіка адзначаем 125-гадовы юбілей народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы.***



**Кандрат Крапіва** (сапр. **Кандрат Кандратавіч Атраховіч)** – беларускі пісьменнік, паэт, сатырык, драматург, перакладчык, грамадскі дзеяч, літаратуразнавец.

«Жаба ў каляіне», «Дыпламаваны баран», «Ганарысты парсюк» ... Хто па школьнай праграме не памятае баек Кандрата Крапівы?

Але вядомы байкапісец пражыў доўгае жыццё, багатае на падзеі, і быў асобай шматгранны. Удзельнік легендарнага аб'яднання "Маладняк", акадэмік, энцыклапедыст, аўтар п'ес і нават фантастычнай паэмы «Хвядос – Чырвоны нос».

У беларускай літаратуры творчая асоба народнага пісьменніка Беларусі Кандрата Крапівы ўзвышаецца велічна і магутна. Яго творчасць – цэлая эпоха ў нацыянальнай драматургіі.

Жыццёвы шлях Кандрата Крапівы быў складаным і насычаным падзеямі.

Нарадзіўся будучы пісьменнік 5 сакавіка 1896 года ў вёсцы Нізок. Потым, з уласцівым яму гумарам, Кандрат Крапіва зазначыць: "У сям'і майго бацькі, Кандрата Міхайлавіча Атраховіча, гэта была выдатная падзея: нарадзіўся наследнік..." Нягледзячы на тое, што спадчына была зусім невялікая, бацьку Кандрата ўсё ж хваляваў яе лёс, бо з васьмярых братоў і сясцёр, што нарадзіліся раней за Кандрата, у жывых засталіся толькі дзве сястры, ды і тое, адна з іх хутка памерла. Як зазначыў далей Кандрат, "...каб застрахаваць мяне ад такога ж лёсу, бабулькі параілі даць мне імя майго бацькі. Так і стаў я на ўсё жыццё Кандратам Кандратавічам..."

Будучы пісьменнік старанна вучыўся.

Асноўнымі жанрамі паэзіі на першым этапе творчасці Кандрата Крапівы сталі байка і сатырычна-гумарыстычныя вершы.

Байкі - адна з вяршыняў у творчасці Кандрата Крапівы. Гэта фенаменальная з'ява ў беларускай літаратуры. У гэтым жанры праявіліся выдатныя якасці народнага філосафа і гуманіста, у ім пісьменнік змог аб'яднаць надзённыя вобразы часу з глыбіннымі праблемамі агульначалавечай маралі, з адвечнымі духоўнымі каштоўнасцямі

У 1930 г. ён заканчвае БДУ і атрымлівае дыплом. Менавіта ў гэтыя часы Кандрат Крапіва паспрабаваў сябе ў ролі драматурга.

Першым драматычным творам пісьменніка была псіхалагічная драма "Канец дружбы", у якой падымаліся складаныя маральна-этычныя праблемы.

Самыя першыя крокі Кандрата Крапівы ў драматургіі былі пазначаны арыгінальнасцю, самастойнасцю, яго голас не згубіўся ў драматургічным хоры, а загучаў чыста, магутна, непаўторна. Яго адметны талент адразу ж быў заўважаны ўсесаюзнай грамадскасцю.

Безумоўным поспехам карысталася і карыстаецца і п’еса “Хто смяецца апошнім”. Мабыць, сёння яна больш актуальная, чым раней!

У 1956 годдзе даволі ўрачыста адзначаўся юбілей пісьменніка. Кандрату Крапіве было прысвоена вышэйшае ганаровае званне - народны пісьменнік Беларусі.Між іншым, гэта званне ён атрымаў першым у рэспубліцы.

У 1976 годзе, калі Кандрату Крапіве было 76 год, выйшла п’еса “Брама неўміручасці”. Выхад гэтай п’есы не быў звычайнай сенсацыяй. Яна прымусіла гаварыць пра сябе вельмі шырока. Гэты твор уразіў чытачоў, а потым і гледачоў, нейкім касмізмам, глабальнасцю праблематыкі. Узлёт пісьменніцкай думкі настолькі высокі, што часам страшнавата з той вышыні заглядаць у бездань чалавечай душы, якая з вышыні і бачыцца лепш, яскравей. Драматург прапануе публіцы вясёлы і ў той жа час вельмі сур’ёзны роздум аб чалавечнасці і неўміручасці.

Камедыя “Брама неўміручасці” пісалася вельмі працяглы час. Гэта, здаецца, адзін з самых асабістых твораў пісьменніка. Фармальна драматург не выведзены ў п’есе, аднак яго прысутнасць адчуваецца за кожнай рэплікай, за выяўленнем сімпатый і антыпатый. Уражвае дакладнасць і

канкрэтнасць апісання навуковай установы, дзе адбылося выдатнае адкрыццё.

"Брама неўміручасці" стала для Кандрата Крапівы п'есай-пераадольваннем. Пераадольваннем ранейшай творчай манеры, прывычных выяўленчых прыёмаў і інш. Характэрна тое, што гэта пераадольванне не адэкватна адмаўленню: у тыпалагічным плане паміж "Брамай неўміручасці" і ранейшымі п'есамі драматурга засталося вельмі многа агульнага.

Акрамя літаратуры, пісьменнік шырока распрацоўваў пытанні мовазнаўства. Пад яго рэдакцыяй былі выдадзены:

- у 1953 годзе Руска-беларускі слоўнік (пад агульнай рэдакцыяй Якуба Коласа, Кандрата Крапівы, Пятра Глебкі);
- Беларуска-рускі слоўнік (каля 90000 слоў);
- другое выданне Руска-беларускага слоўніка (2 тамы);
- тлумачальны слоўнік беларускай мовы і інш.



У 1975 годзе Кандрату Крапіве было нададзена ганаровае званне Героя Сацыялістычнай Працы, а ў 1978 г. – заслужанага дзеяча навукі БССР.

Паэт, байкапісец, празаік, перакладчык, тэарэтык літаратуры, вучоны-мовазнавец, грамадскі дзеяч – ва ўсіх галінах жыцця К.Крапіва пакінуў глыбінны і яркі след.

Вось такімі насычанымі былі творчасць і жыццё нашага славутага земляка, які скончыў свой зямны шлях 7 студзеня 1991 года.



***14 сакавіка 90-гадовы юбілей у Паўла Міська,*** беларускага пісьменніка, паэта, публіцыста, перакладчыка, драматурга.

Як хутка ляціць час… Здаецца, ты зусім нядаўна з задавальненнем перагортваў старонкі толькі-толькі выдадзеных "Бубльбобаў" ды "Як на нашы імяніны" аб прыгодах Колі і Толі ды іх верных сяброў Булькі і Боба, а стваральніку ўжо 90!

Нарадзіўся будучы літаратар ў вёсцы Старцевичи Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і селяніна. Мабыць, таму так часта ў сваіх творах пісьменнік вяртаецца ў веску… Менавіта вёсцы і вясковаму жыццю прысвечаны творы “Калодзеж”, “Градабой”, “Ціхае лета”, «Падарожжа ў калгас», «Зямля ў нас такая».

Не абмінуў у сваіх творах Павел Місько і тэму вайны.

Але больш за ўсё ён вядомы як аўтар кніг для дзяцей.




Павел Місько - аўтар казак і фантастычных твораў. Сярод яго твораў - аповесці «Грот афаліны" (1985) і «Эрпіды на планеце Зямля» (1987). Яго аповесць «Прыгоды Бульбобаў" (1977) пра прыгоды пацешных сабачак Булькі і Боба таксама можна аднесці да фантастыкі, а аповесць «На зачараваным востраве, або Баба Яга - Залатая Нага» (1978) уяўляе сабой ненавуковы фантастычны дэтэктыў для дзяцей.

У 2007 годзе выйшла апошняя кніга пісьменніка «Прысуджаны да жыцця». У новую кнігу прозы Паўла Місько ўвайшлі творы, якія былі напісаныя ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. і адлюстроўвалі псіхалогію чалавека на пераломе гісторыі. Рэальнае ў іх пераплятаецца з фантастычным, а фантастычнае – з антыутопіяй. Аповесці, дзеянні ў якіх адбываюцца на абшарах ад чарнобыльскай вёскі да далёкіх планет, не пакінуць абыякавымі аматараў вострых адчуванняў, а таксама тых, хто знудзіўся па дабраякаснай прозе.

***"Прыгавораны да жыцця"*** (апавяданне) знаёміць чытача з таемнымі тэхналогіямі Трэцяга рэйха і рэінкарнацыяй па-беларуску.

***"Востраў "Мёртвая галава"*** (аповесць) гэта споведзь астранаўта, з якой вы даведаецеся, што можа адбыцца ў далёкім космасе, калі на зоркалёце жанчын удвая меней, чым мужчын, і як уплывае незямная атмасфера на зямныя пачуцці.

Хоць дзеянне аповесці-антыўтопіі ***"Ніль адмірары, або Я выбіраю смерць"*** адбываецца ў кальдэры старога вулкана ў Каліфорніі, уважлівы чытач пабачыць знаёмыя любому беларусу рэаліі...

***Аповесць "Зялёныя змеі"*** – вострасюжэтны чарнобыльскі трылер пра ўшанаванне продкаў.

Павел Місько - аўтар зборнікаў гумару «Дзівак-чалавек», «Чэрці ў коміне», «Вясельны марафон», «Лекцыя з падвывам».

Пайшоў з жыцця 9 чэрвеня 2011 года.

Мабыць, калі б мы дакраналіся з дзяцінства да дабрыні твораў Паўла Місько, дык і жыццё наша было б больш чулым і добрым…

***Спадары, чытайце беларускае і па беларуску, бо гэта ж мова нашых дзедаў і прадзедаў, мова нашых матуль і нашых мрояў….***

***Вялікаму філосафу І. Ільіну належаць словы: "Ёсць закон людскасці, прыроды і культуры, у адпаведнасці з якім усё вартае можа быць сказана чалавекам альбо народам толькі па- свойму і ўсё геніяльнае нараджаецца менавіта ў рэчышчы нацыянальнага вопыту, духу і стану рэчаў.***

***У выпадку дэнацыяналізацыі чалавек губляе падыходы да найглыбейшых крыніцаў духу і да святога агменю жыцця, бо гэтыя крыніцы і гэты агмень заўжды нацыянальныя: у іх закладзеныя і жывуць цэлыя стагоддзі ўсенароднай працы, пакут, барацьбы, роздуму, малітваў і думкі. Чалавек, які страціў падыход да духоўнай вады і духоўнага агменю свайго народу, робіцца бязродным... і марным бадзягам па чужых духоўных шляхах, безаблічным інтэрнацыяналістам. Гора яму і яго дзецям: ім пагражае небяспека ператварыцца ў гістарычны пясок і смецце..."***

***Чытайце па беларуску, думайце па беларуску, разважайце па беларуску, как не ператварыцца ў Іванаў, якія ня памятаюць сваяцтва….***